

НОВАЕ Ў ДЭКРЭТНЫХ ВЫПЛАТАХ

Сямейная газета

РАМАНТЫКА РАМАНЬКОВЫХ



Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 КРАСАВІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 77 (30211)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАРТУН, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«У эканоміцы захоўваецца ўстойлівая станоўчая дынаміка: прырост сакавіка 2024-га да сакавіка мінулага года складае 4,3 працэнта. Захоўвае высокія тэмпы прамысловасць: у студзені — сакавіку 2024 года — 106,5 працэнта. Добрыя вынікі дэманструе сельская гаспадарка (106,8 працэнта). Упэўнена расце і гандаль: рознічны — 113,1 працэнта, аптовы — 105,8 працэнта, што звязана ў многім з апераджальным ростам рэальных даходаў насельніцтва, а таксама стрыманым ростам індэкса спажывецкіх цэн. Гадавая інфляцыя ў сакавіку захавалася на ўзроўні 5,6 працэнта, што разам з эфектыўнай работай эканомікі дае магчымасць забяспечваць высокі ўзровень заработнай платы — больш як 2 тысячы рублёў у лютым гэтага года. Працоўныя пенсіі ў рэальным выяўленні таксама выраслі — на 9,1 працэнта».*

# Палёты ўяўныя, потым — наяве



**У Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі шэраг лабараторных заняткаў праходзіць пры дапамозе дапоўненай і віртуальнай рэальнасці. Падыход цікавы і актуальны для сучаснага пакалення. Ён дазваляе не толькі дасканала вывучыць алгарытм дзеянняў, але і ўбачыць у 3D-плоскасці драбнюткія дэталі механізма.**

**Так, на фота курсанты 3-га курса спецыяльнасці «Тэхнічная эксплуатацыя паветраных суднаў і рухавікоў» Вадзім ШЫБУН і Аляксей КАСАРЭВІЧ выконваюць віртуальны навучальны комплекс па тэхнічным абслугоўванні самалёта BOEING 737NG.**

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- ВУП Беларусі ў першым квартале 2024 года вырас на 4,1 працэнта.
- **У 2023 годзе ў вадаёмах краіны вылаўлена 15,1 тыс. т рыбы, з іх на прамысловы ўлоў прыпадала 56,4 працэнта (8,5 тыс. т).**
- Торфабрыкетныя заводы «Белпалівагаза» дамовіліся аб новых экспартных пастаўках у Казахстан.
- **У Гомельскай вобласці 80 працэнтаў дзяцей-сірот выхоўваюцца ў замяшчальных сем'ях.**
- Раннія яравыя збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі, проса) пасеяны на 527,6 тыс. га, што складае 85,7 працэнта да плана.

Абітурыент-2024

## ЧАС МАЛАДЫХ

Сённяшнія абітурыенты валодаюць самай поўнай і падрабязнай інфармацыяй, неабходнай пры паступленні



**Мы ўсё бліжэй падыходзім да аднаго з самых эмацыянальных і хвалюючых перыядаў у жыцці нашага грамадства. І гэта без перабольшання — выпускная і ўступная кампаніі вызначаюць далейшы шлях дзясяткаў тысяч маладога насельніцтва Беларусі. Іх будучыня — гэта будучыня нашай краіны. Такі напружаны для школьнікаў, абітурыентаў, іх бацькоў, настаўнікаў і выкладчыкаў перыяд спецыялісты Міністэрства адукацыі, ВНУ і каледжаў імкнуцца максімальна аблегчыць, напаўняючы актуальнай інфармацыяй па ўступнай кампаніі свае сайты і тэлеграм-каналы.**

СТАР. 3

Прыклад для пераймання

## Прафесійна, аператыўна, па-добраму

**На рэспубліканскім семінары-нарадзе разглядалі актуальныя пытанні дзейнасці службы «адно акно»**

**На семінар, які праходзіў у Брэсце, сабралася каля 80 спецыялістаў з усіх рэгіёнаў краіны. У ходзе нарады падкрэслівалася важнасць аператыўнага і якаснага аказання паслуг, а таксама добрых адносін да грамадзяніна, які звярнуўся ў дзяржаўную структуру. Калі ва ўстанове сустрэлі з усмешкай, падрабязна растлумачылі, дапамаглі, то чалавек выйдзе з добрым настроем і панясе яго ў сям'ю, калектыў, у асяродак суседзяў. Апошняе паспрыяе адсутнасці сацыяльнай напружанасці, вядзе да згоды ў грамадстве. Вось у такім ключы і вялася размова па актуальнай тэме.**



Прадстаўнікі розных рэгіёнаў падзяліліся вопытам, абмяркоўвалі праблемныя пытанні. Варта сказаць, чаму менавіта Брэст быў выбраны месцам правядзення падобнага мерапрыемства.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

24077

9 771990 763008